4. Праграма выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Мн.: БДТУ, 2001. – С. 72–74.
5. Харламов И. Ф. Педагогика. Мн.: Университетское, 1998. – С. 560.
6. Беларуская думка. – 2002. – № 11–12. – С. 88.

УДК 378.4:331.101.264.2(476)

П.В. Дзядзюля, дацэнт

## РОЛЯ БДТУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАДРАЎ

The BSTU is perfecting its system of educational arrangements on the improvement of training a specialist.

...Толькі тое выхаванне добраахвотнае,
якое абапіраецца на нацыянальныя карані.
К.Д. Ушынскі

Калі з пэўнай доляй умоўнасці ўзяць за ўзор цывілізацыю краін Заходняй Еўропы, то неаспрэчна канстатацыя – выхаваўчыя ідэі кожнага народа прасякнуты найперш нацыянальным.

Стагоддзямі «нацыя», «народ», «дзяржава» з'яўляліся інтэгрыруючымі паняццямі. Не выпадкова Гегель сцвярджаў, што «дзяржава – гэта шэсце Бога ў свеце, яе асновай служыць улада розуму, якая здзяйсняе сябе як волю» [1]. Вядомы нямецкі палітолаг М. Вэбер разглядаў нацыю як палітычную катэгорыю, якая можа быць вызначана толькі ў адносінах да дзяржавы, хаця яна і не раўназначна ёй [2].

На сувязь адраджэння дзяржаўнасці з прагрэсам Беларусі ўказвалі ў XX ст. шматлікія беларускія патрыёты, сапраўдныя інтэлігенты. Напрыклад, вядомы беларускі публіцыст Уладзімір Самойла ў пачатку 20-х гадоў пісаў, што толькі нацыянальная дзяржава дазволіць беларусам заняць належнае месца сярод цывілізаваных народаў, адстаяць права на свабоднае развіццё.

Пазнанне нацыянальнай гісторыі, культуры, характару – важнейшая ўмова ў пошуках аптымальных варыянтаў арыентацыі моладзі Беларусі.

Выхаваўчая работа ва універсітэце павінна быць падпарадкавана фарміванню нацыянальна-свядомага, усебакова развітага, зарыентаванага на творчае засваенне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі, скіраванага на практычную дзейнасць ва ўмовах рыначнай эканомікі спецыяліста. Наш выпускнік павінен ганарыцца тым, што ён грамадзянін незалежнай Беларусі.

Выкладанне прадметаў гуманітарнага цыкла, якое забяспечваюць кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі, беларускай мовы, філасофіі і права, замежных моў, дазваляе ахапіць усе аспекты выхавання маладога чалавека і садзейнічаць стварэнню тэарэтычнай базы выхаваўчай работы са студэнтамі БДТУ.

* * *

Усімі магчымымі сродкамі павышаць аўтарытэт нашага універсітэта, змагацца за свайго абітурыента. Для гэтага неабходна выпусціць шэраг самых разнастайных, прыгожых буклетаў, у якіх адлюстраваць гісторыю БДТУ, яго факультэтаў, кафедр. Даць кароткія, яркія нарысы пра лепшых выкладчыкаў, прасачыць жыццёвыя шляхі таленавітых выкладчыкаў, падабраць карцінкі з жыцця сённяшніх студэнтаў, раскрыць магчымасці нашых спецыялістаў ва ўмовах рыначнай эканомікі і г. д. Падкрэсліць адметнае месца БДТУ сярод вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Еўропы, Расіі, каш-

тоўнасць, канверсуемасць нашага дыплома. Пры распрацоўцы рэкламных матэрыялаў неабходна паказаць і ўсёўзрастаючую матэрыяльна-тэхнічную вучэбную базу універсітэта, якая дазволіць студэнту стаць спецыялістам высокага класа. Знайсці магчымасць распаўсюджваць агітацыйна-рэкламныя матэрыялы праз радыё, тэлебачанне, газеты, часопісы. Арганізаваць на гэтую справу лепшых выкладчыкаў, студэнтаў.

Дзень адчыненых дзвярэй для абітурыентаў рабіць святам універсітэта, якому павінна быць напярэдадні вялікая падрыхтоўка ўсяго калектыву. Будучы наш студэнт павінен убачыць чысціню вестыбюляў, калідораў, аўдыторый, багацце лабараторый. Няхай паўсюдна яго сустракаюць партрэты сусветна вядомых вучоных і знакамітых людзей Беларусі. Прадугледжваць удзел у гэтым свяце прадстаўнікоў рэктарата, кіраўнікоў факультэтаў, кафедр.

Немалаважным фактарам у выхаванні нашых будучых студэнтаў павінна стаць дзейнасць прыёмнай камісіі. Прафесіяналізм, кампетэнтнасць, ветлівасць, добразычлівасць і іншыя якасці – гэта тая візітная картка, той знак, якія павысяць рэйтынг універсітэта.

Праблемы першакурсніка

У чым іх бачыць аўтар гэтых радкоў? Пераход нядаўняга школьніка да студэнцкага жыцця зусім не просты этап станаўлення маладого чалавека. З аднаго боку, радасць, магчымасць адчуць сябе дарослым, пашырыць кола сяброў, атрымаць пэўную свабоду. З другога боку – гэта новыя эмацыянальныя, псіхалагічныя нагрузкі, з якімі юнакі і дзяўчаты не заўсёды спраўляюцца. Адаптацыя да новых умоў жыцця патрабуе значных душэўных намаганняў.

На гэтым этапе студэнцкага жыцця важную ролю павінен іграць вопытны куратар-педагог. Відаць, трэба мяняць падыход да падбору іх менавіта на першым курсе, больш выразна акрэсліваць кола іх абавязкаў. На нейкі час куратар павінен стаць для першакурсніка старэйшым сябрам, у меру строгім, тактоўным, клапатлівым, зацікаўленым у справах студэнта.

Назначаць яго трэба ўжо ў канцы папярэдняга навучальнага года. І каб у першы тыдзень верасня ў раскладзе заняткаў стаяла куратарская гадзіна, якая б магла стаць уверцюрай да сімфоніі студэнцкага жыцця, калі педагог як бы возьме кожнага за руку і ўвядзе ў храм ведаў, раскрые ўвесь спектр праблем і засцеражэ ад памылак.

Неабходна прадугледзець і пэўныя льготы для куратараў І курса, нейкія формы заахвочвання, але пастаянна прад'яўляць і патрабаванні эфектыўнай работы.

Практыкаваць хоць бы эпізадычна запрашэнне вопытнага псіхолага, які час ад часу працаваў бы з куратарамі і пры патрэбе змог бы аказваць прафесіянальную дапамогу студэнтам, якія з цяжкасцямі праходзяць адаптацыю і маюць праблемы з вучобай.

* * *

Патрэбны цвёрдыя прынцыпы ў суадносінах студэнт – адміністрацыя – інтэрнат. Зрабіць правілам – першакурснікаў сяліць у адрамантаваныя, чыстыя з наборам неабходнага інвентару пакоі. Максімум ветлівасці і карэктная патрабавальнасць. З тэхнічным персаналам напярэдадні навучальнага года можна правесці інструктыўную бяседу вопытнага педагога. Папярэдзіць аб недапушчальнасці грубасці ў адносінах да студэнтаў. Выразы тыпу: «У мамы будзеш патрабаваць!» – на просьбу студэнта замяніць брудную бялізну выключаюцца.

Засяляюць у пакоі, як правіла, студэнтаў адной групы. Лічыць магчымым з ведама адміністрацыі дазвол студэнтам і іх бацькам рабіць невялікі касметычны рамонт пакоя.

Рабіць усё магчымае, каб студэнт усе 5 гадоў жыў у адным і тым жа пакоі і нёс матэрыяльную адказнасць за маёмасць, якою ён будзе карыстацца.

Першы дзень навучальнага года

Распрацаваць тэатралізаванае пасвячэнне ў студэнты. Тут павінна быць месца і кароткай сур'ёзнай размове, але больш жартаў, цікавых экскурсаў у гісторыю, дасціпных назіранняў, ведання розных бакоў студэнцкага жыцця. Для грунтоўнай падрыхтоўкі такой дзеі стварыць пастаянна дзейнічаючы савет.

Да гэтага ж дня рыхтаваць штогод экскурсаводаў з ліку студэнтаў старэйшых курсаў, якія правядуць першакурснікаў па універсітэцкім музеі і раскажуць ім пра вялікі, багаты на розныя падзеі шлях ужо і іхняга дома.

У студэнцкія групы прыдуць найбольш вопытныя, паважаныя прафесары, дацэнты і правядуць кароткія гутаркі на тэмы разнастайнага жыцця БДТУ. Не лішнім было б запрасіць на такія сустрэчы і выпускнікоў універсітэта, якія маюць аўтарытэт у грамадстве і якім ёсць што сказаць маладым. У час гэтых гутарак можна было б паразважаць пра асаблівасці інжынернай дзейнасці, якая, па сутнасці, накіравана ў будучыню.

У першы і наступныя дні пастаянна даводзіць, што мы жывём і павінны жыць у незалежнай, свабоднай Беларусі, дзе гарантуюцца правы і свабоды ўсіх грамадзян, дзе пануе плюралізм думак, ідэй, і што будучыня маладых неад'емная ад будучыні краіны.

Знайсці магчымасць прачытаць студэнтам спецыяльны курс «Гісторыя сусветнага студэнцкага руху», дзе паказаць вопыт маладзёжнай палітыкі найперш краін Еўропы, нашых блізкіх суседзяў. Усяляк стымуляваць самадзейнасць студэнтаў. Раскрыць ім магчымасці ўдзелу ў творчых, спартыўных, турысцкіх, прафесійных арганізацыях. Стымуляваць іх жаданне падарожнічаць па Беларусі і за яе межамі. Прафсаюзнаму камітэту разам са студэнцкім актывам заняцца зборам даных аб рабочых месцах, дзе жадаючыя маглі б у зручны для сябе час працаваць.

Выхаваўчая работа ў значнай ступені залежыць ад творчай актыўнасці ўсіх кафедр, а не толькі ад кафедр гуманітарных навук. Сапраўдны вучоны-педагог стварае вакол сябе інтэлектуальнае поле прыцяжэння, у магутных імпульсах якога павінны знаходзіцца студэнты, будучая эліта нашай краіны. Так было ва ўсе перыяды існавання вышэйшай школы. Настаўнік вёў за сабой вучня, захапляў, браў у палон сваімі смелымі ідэямі, розумам. Ці многія вучоныя нашага універсітэта могуць сказаць, што нехта з маладых, таленавітых пачынаў у яго лабараторыі ці падхопліваў ідэі мэтра за кубачкам кавы ў час нязмушанай бяседы дзе-небудзь на дачы, а то і ў хатнім інтэр'еры.

Напрыклад, значныя магчымасці па выхаванні пэўных якасцей маладога чалавека дае выкладанне камп'ютэрнай тэхнікі, праграмавання. Тым больш што пераход ад традыцыйных форм навучання да камп'ютэрных часам прыводзіць да сітуацыі, у якой вучань адчувае сябе няўпэўнена. Сутыкаючыся з непрадказальнымі і нечаканымі для сябе вынікамі апрацоўкі інфармацыі, студэнты не заўсёды могуць даць правільную ацэнку сваім дзеянням, адчуваюць страх і няўпэўненасць.

Важнай тут з'яўляецца праблема фарміравання новага інжынернага мыслення. Здаецца відавочным, што камп'ютэр можа быць выкарыстаны як сродак развіцця разумных здольнасцей чалавека. Роля камп'ютэра заключаецца ў тым, што ён пашырае для кожнага чалавека магчымасці доступу да інфармацыі і яе аператыўнага выкарыстання. Камп'ютэры могуць выступіць у ролі вельмі моцнага сродку развіцця працэсу аперыравання з вобразамі, іх трансфармавання і камбінавання, гэта значыць развіцця ўяўлення. Выкарыстанне камп'ютэра ў працэсе мыслення можа дапамагчы фарміраванню ў студэнта ўмення «бачыць» пытанне, рабіць разумны эксперымент і

г. д. Праблема заключаецца ў тым, каб вызначыць ступень уплыву выкарыстання камп'ютэра на працэс развіцця мыслення пры навучанні. Магчыма, было б карысным правядзенне адпаведнай універсітэцкай кафедрай эксперымента для выяўлення ўзроўню атрыманых ведаў, іх замацавання і праверкі астатковых ведаў з выкарыстаннем традыцыйнага і камп'ютэрнага метадаў навучання, а таксама пры вывучэнні аднатыпных, але розных пакетаў праграм.

Гэты эксперымент варта было б правесці з сумесным удзелам спецыялістаў па вылічальнай тэхніцы, інфарматыцы і псіхолагаў. Неабходна развіваць пагранічную вобласць навукі на стыку педагогікі і псіхалогіі, з аднаго боку, і інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі – з другога.

Выкладчыкі ўсіх кафедр універсітэта павінны перагледзець арсенал сродкаў выхавання студэнтаў з улікам карэнных змен у краіне. Падтрымліваць усяляк таленавітых, раскрываць магчымасці кожнага, вучыць на аснове сусветнага вопыту.

ЛІТАРАТУРА

1. Гегель Г. Философия права. – М.: Наука, 1990. – С. 284.

2. См. Национальные интересы: теория и практика. Сборник статей. – М.: АН СССР, 1991. – С. 16.

УДК 37.034:378

Г.П. Дудчик, доцент

## МАССОВОСТЬ КУЛЬТУРЫ И ОБРАЗОВАНИЯ И ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ЛИЧНОСТИ СТУДЕНТА

The problems of student moral education at modern point of development of society are discussed.

А теперь пребывают сии три: вера, надежда, любовь; но любовь из них больше.

Св. апостол Павел. 1-е послание Коринфянам, гл. 13

На современном этапе развития мирового сообщества во всех сферах человеческой деятельности происходят изменения принципиального характера – небывалый технический прогресс на основе наукоемких технологий и стремительное развитие новых коммуникационных технологий, обеспечивающих возможность взаимодействия как отдельных людей, так и целых народов. Наблюдаются беспримерная во всей истории человечества взаимозависимость всех и каждого и развитие международного сотрудничества – то, что сейчас принято характеризовать термином *глобализация.* Технический прогресс в режиме глобализации, возможно, единственный шанс для выживания миллионов. Вместе с тем он ведет к серьезным проблемам: экологическим, связанным с занятостью населения и др. Тесное международное сотрудничество обнаруживает огромные неравенства между странами, которые пользуются плодами технического прогресса, и теми, что остались от него в стороне. Эти неравенства становятся причиной серьезных международных конфликтов и создают большую напряженность в развитии мирового сообщества. Небывалое развитие современных средств связи и информации таит в себе опасность стандартизации культуры, исчезновения культурного многообразия под давлением идеологии тех стран, которые доминируют технологически.